**Шчарбакоў Васіль Васільевіч** // Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Полацкага р-на. – Мн. : Вышэйшая школа, 1999. – С. 645.

**Шчарбакоў Васіль Васільевіч.** Нарадзіўся 20.04.1951 г. у в. Казімірова. З 1968 г. працаваў у Наваполацкім мантажным упраўленні трэста "Нафтазаводмантаж" і адначасова займаўся ў Віцебскім аэраклубе. З 1970 г. у Савецкай Арміі. Пасля заканчэння Сызранскага ваеннага вучылішча лётчыкаў служыў у Сярэднеазіяцкай ваеннай акрузе. У дні ліквідацыі вынікаў землетрасенняў ў Кіргізіі аказваў дапамогу пацярпеламу насельніцтву, ратаваў альпіністаў, дапамагаў пагранічнікам, удзельнічаў у пошуках і эвакуацыі экіпажаў касмічных караблёў. У 1979–1980 гг. кіраваў адной з груп верталётаў, якія ўваходзілі ў склад абмежаванага кантынгента савецкіх войск на тэрыторыі Афганістана. Зрабіў больш як 300 баявых вылетаў. За паспяховае выкананне заданняў прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Закончыў камандны факультэт Ваенна-паветранай акадэміі імя Ю.А. Гагарына.